5. Котляр, Н. Ф. Галицко-Волынская летопись. Текст, Комментарий. Исследование / Н. Ф. Котляр. – СПб. : Алетейя, 2005. – 425 с.
6. Новгородская первая летопись старшего и младшего изводов. – М. : ЯРК, 2000. – 720 с.
7. Повесть временных лет / под ред. В. П. Адриановой-Перетц. – Изд. 2-е, испр. и доп. – СПб. : Наука, 1996. – 668 с.
8. Приселков, М. Д. Троицкая летопись : Реконструкция текста / М. Д. Приселков. – М. ; Л. : Изд-во Акад. наук СССР, 1950. – 515 с.
9. Радзивиловская летопись // Полное собрание русских летописей. – Т. 38. – Л. : Наука, Ленинградское отделение, 1989. – 177 с.
10. Щавелева, Н. И. Древняя Русь в «Польской истории» Яна Длугоша (книги I–VI): Текст, перевод, комментарий / Н. И. Щавелева. – М. : Памятники исторической мысли, 2004. – 495 с.
11. Błaszczyk, G. Dzieje stosunków polsko-litewskich od czasów naidawniejszych do współczesności / Grzegorz Błaszczyk. – Tom I. Trudne początki. – Poznań : Wydawnictwo naukowe UAM, 1998. – 304 s.
12. Jana Długosza Kanonika Krakowskiego Dziejów Polskich ksiąg dwanaście / Wydane staraniem A. Przezdzieckiego. – T. I. – Ks. I, II, III, IV. – Kraków : W drukarni “Czasu” W. Kircumayera, 1867. – 519 s.
13. Jana Długosza Kanonika Krakowskiego Dziejów Polskich ksiąg dwanaście / Wydane staraniem A. Przezdzieckiego. – T. II. – Ks. V, VI, VII, VIII. – Kraków : W drukarni “Czasu” W. Kircumayera, 1868. – 530 s.
14. Jana Długosza Kanonika Krakowskiego Dziejów Polskich ksiąg dwanaście / Wydane staraniem A. Przezdzieckiego. – T. III. – Ks. IX, X. – Kraków, 1868. – 480 s.
15. Monumenta Poloniae Historica. Pomniki dziejowe Polski. – T. III. – Lwów : W komisie księgarni Gubrynowicza i Schmidta, 1878. – 876 p.

**Нікіфаровіч М.А.**

## ВІСЛАЯ ПЯЧАТКА XII ст. З ВЫЯВАЙ СВЯТОЙ АЛЕНЫ З ХОЙНІЦКАГА РАЁНА ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ: СПРОБА АТРЫБУЦЫІ

У 2023 г. пры правядзенні сельскагаспадарчых прац на полі бліз в. Высокае (Стралічаўскі сельсавет), Хойніцкага р-на, Гомельскай вобл., прыватнай асобай была знойдзена свінцовая віслая актавая пячатка – була. Падрабязная інфармацыя аб знаходцы разам з яе фатаздымкамі былі перададзеныя аўтару артыкула для вывучэння і атрыбуцыі. Була ўяўляе несумненную цікавасць для даследчыкаў.

Сярэднявечныя актавыя пячаткі адносяцца да рэчаў, якія з’яўляюцца паказчыкам справаводства і дакументазвароту эпохі станаўлення і росквіту першых дзяржаўных утварэнняў на тэрыторыі Усходняй Еўропы. Пячаткі такогда тыпу з’яўляюцца прамым адлюстраваннем самаасэнсавання і разумення сваёй ролі ў дзяржаўным кіраванні прадстаўнікамі вышэйшай палітычнай, вайсковай і духоўнай улады, а таксама паказчыкам дыпламатычных адносін.

Сучасныя археалагічныя дадзеныя дазваляюць казаць, што на значнай частцы тэрыторыі Усходняй Еўропы ў перыяд з X па XV стст. віслыя пячаткі мелі досыць шырокае распаўсюджанне [1, с. 241; 2]. Не выключэннем з’яўлялася і тэрыторыя сучаснай Беларусі, дзе за апошнія дзесяцігоддзі было знойдзена не малая колькасць падобных артэфактаў [3, с. 14; 4; 5, с. 24–26; 6, с. 93], прыналежных як выхадццам з беларускіх земляў, так і іншаземцам.

Віслыя пячаткі прымацоўваліся – падвешваліся на дакумент, ад чаго і атрымалі сваю назву. Як правіла, яны ўяўляюць з сябе акруглы прадмет з мяккага металу (звычайна свінца), на якім з абодвух бакоў адціскаліся выявы святых і надпісы.

Віслыя пячаткі традыцыйна выконвалі некалькі асноўных функцый, сярод якіх наданне дакументу юрыдычнай моцы, падкрэсленне яго аўтэнтычнасці і ўказанне на асобу, ад якой сыходзіць дакумент. Зыходзячы з выдзеленага функцыяналу падобных пячатак зразумела, што выкарыстоўваць у часы сярэднявечча іх маглі выключна людзі з вышэйшых колаў грамадства, перадусім князі, набліжаныя да іх асобы, прадстаўнікі вышэйшага духавенства, вайсковыя кіраўнікі і інш. Адзін з традыцыйных тыпаў афармлення віслых пячатак XI–XII стст., да якога належыць і пячатка, апісаная ў артыкуле, уключаў ў сябе адціснанне на металічнай нарыхтоўцы рэльефнай выявы святога нябёснага заступніка асобы, якой належала пячатка, а таксама малельнага

надпісу. Сэнсавыя асаблівасці такога роду інфармацыі дазваляюць меркаваць аб наданні падобным булам акрамя іншага і сакральнай – абярэжнай – функцыі.

Знойдзеная на тэрыторыі Хойніцкага раёна віслая пячатка акруглай формы з двухбаковым адціснутым адбіткам.

Памеры: дыяметр: 2,2 см, таўшчыня: 0,4 см.

Вага: 12,8 г.

Матэрыял: свінец.

Спосаб вырабу: адцісканне на літой загатоўцы.

На аверсе вырабу (Мал. 1) размяшчаецца пагруднае аблічча Святой роўнаапостальнай Алены без кароны, з крыжом (?) у левай руцэ, правая рука складзена ў дабраслаўляльным жэсце. Злева ад аблічча знаходзіцца вертыкальны надпіс «НАГІА», зправа – вертыкальны надпіс «ОЛЕNІ», што ў словазлучэнні выглядае як «НАГІА ОЛЕNІ» – «Святая Алена». Адбітак змешчаны ўлева і ўверх адносна цэнтра поля нарыхтоўкі і крыху выходзіць за яе край.

На рэверсе вырабу (Мал. 2) размешчаны чатырохрадковы гарызантальны тэкставы надпіс, які займае ўсё поле пячаткі: «Г῀НПОМ / ОZНРАБЕ / СВОЕОЛ / ЕNА» – «Госпадзе, дапамажы рабе сваёй Алене». Адбітак зрушаны ўлева і ўверх адносна цэнтра поля нарыхтоўкі і крыху выходзіць за яе край. На ніжняй яе палове прысутнічае адтуліна ад шнура для падвешвання, змешчаная з тарцовай паверхні нарыхтоўкі.




*Мал. 1.* Аверс пячаткі



*Мал. 2.* Рэверс пячаткі

Прадстаўленая віслая пячатка адносіцца да тыпу пячатак з выявай аблічча святога заступніка на аверсе і формулай “Госпадзе, дапамажы рабу(е) свайму(ёй)…” на рэверсе. З’яўленне булаў гэтага тыпу менавіта з кірылічным надпісам даследчыкі традыцыйна адносяць да пачатку XII ст. [7, с. 25–26].

Як аналагі апісанага прадмета можна прывесці пячаткі, знойдзеныя ў розныя гады на тэрыторыі Украіны [8; 9]. Зараз мы маем звесткі аб некалькіх разнатыпных булах з выявай Св. Алены [10, с. 108–118; 11, с. 488–502], але частка з іх знаходзіцца ў прыватных калекцыях.

Паспрабуем разабрацца ў прыналежнасці пячаткі. Відавочна, што выключнай дакладнасці ў гэтым пытанні быць не можа. З упэўненасцю можна казаць толькі аб тым, што була належала жанчыне з высокага саслоўя, нябёсным заступнікам якой была Св. Алена, імя якой яна хутчэй за ўсё і насіла. Гэта шляхетная жанчына магла ўдзельнічаць у дзяржаўным кіраванні, мець паўнамоцтвы на складанне дамоў, зацверджанне афіцыйных дакументаў, удзел ў дыпламатычнай працы і інш. Яе дзейнасць, адпаведна датыроўцы пячатак гэтага тыпу, прыходзілася на час не раней за XII ст. Маючы на ўвазе ўсе прыведзеныя факты, у такой асобе папярэдне можна

разглядзець жонку аднаго з сыноў Уладзіміра Усеваладавіча Манамаха – князя пераяслаўскага і вялікага князя кіеўскага Яраполка Уладзіміравіча (1082–1139 гг.).

Паводле летапісных звестак мы ведаем, што ў 1116 г., па даручэнні бацькі, Яраполк Уладзіміравіч разам са сваім стрыечным братам Усеваладам Давыдавічам здзяйсняе паход супраць полаўцаў на Северскі Данец, дзе захоплівае тры гарады. Там Яраполкам таксама была запалонена дачка яскага князя, якая ў будучым стала яго жонкай і была вядомая на Русі пад сваім хрысцільным імем Алена (Ѡлена). Іпацьеўскі летапіс гэтыя падзеі апісвае наступным чынам: *“В лѣто 6624… в се же лѣто посла Володимеръ сн҃а своего Ӕрополка а Дв҃дъ сн҃а своего Всеволода на Донъ и взѧша три грады Сугровъ Шаруканъ Балинъ. Тогда же Ӕрополкъ приведе собѣ жену красну велми”* [12, с. 197]. У Радзівілаўскім летапісе дадзеная падзея нават суправаджаецца мініяцюрай (Мал. 3), якая верагодна паказвае Яраполка Уладзіміравіча і яго жонку Алену пры двары Уладзіміра Усеваладавіча.



*Мал. 3.* Мініяцюра з Радзівілаўскага летапісу

Пасля заняцця Яраполкам Уладзіміравічам у 1132 г. кіеўскага стала, яго палітычнае становішча ўскладнілася. Час кіравання князя адзначаецца ўзмацненнем міжусобіц. Уплыў Кіева на падкантрольныя і прылеглыя тэрыторыі стаў слабнуць. Яраполку прыходзілася як шмат ваяваць, так і актыўна заключаць мірныя дамовы. Гэты перыяд хутчэй за ўсё і прыходзіцца на час вырабу апісанай у артыкуле пячаткі. Жонка вялікага кіеўскага князя Алена, відавочна, дапамагала мужу з разнастайнымі дзяржаўнымі справамі. Менавіта праз гэта, разам з нейкім дакументам, пячатка княжны і магла трапіць на тэрыторыю сучанага Хойніцкага раёна. У пісьмовых крыніцах гэты рэгіён узгадваецца пад 1142 г. (Іпацьеўскі летапіс), як падкантрольная Чарнігаўскаму княству тэрыторыя.

Паміраe Яраполк Уладзіміравіч 18 лютага 1139 г., перадаўшы кіеўскі пасад свайму брату Вячаславу Уладзіміравічу. *“Въ лѣто 6647… того же лѣта престависѧ кн҃зь Ӕрополкъ мс҃ца февралѧ въ иі҃ дн҃ь и положенъ быс въ Ӕнцинѣ манастыри…”* [12, с. 210]. Сама ж Алена ў апошні раз летапісцам узгадваецца пад 1145 г., калі яна перапахавала парэшткі свайго мужа ў царкве Св. Андрэя. *“В лѣто 6653… В то же лѣто перенесе бл҃говѣрнаѧ кнѧгини Ѡлена Ӕска кн҃зѧ своего Ӕрополка из гробницѣ въ црк҃вь ст҃го Андрѣѧ и положи его оу Ӕнкы”* [12, с. 222].

Такім чынам, як бачна з тэксту артыкула, знойдзеная бліз в. Высокае, Хойніцкага р-на, Гомельскай вобл. віслая пячатка з выявай Св. роўнаапостальнай Алены, тэарэтычна магла належыць жонцы князя пераяслаўскага і вялікага князя кіеўскага

Ярапалка Уладзіміравіча Алене. Калі прытрымлівацца гэтай версіі, то вырабніцтва булы варта датаваць часам не раней за 1116 г., але хутчэй за ўсё гэта прамежак паміж 1132 і 1139 гг. – перыяд ад пачатку княжання Ярапалка ў Кіеве, да яго смерці. Сам факт таго, што пячатка належала жанчыне, з'яўляецца важным прыкладам, які дэманструе ролю жанчыны ў дзяржаўным кіраванні.

Супастаўленне прадстаўленай віслай пячаткі з іншымі буламі з выявай Св. Алены, спасылкі на якія даюцца ў артыкуле, дазваляе казаць аб іх падабенстве. Гэты факт з'яўляецца доказам прыналежнасці такіх пячатак адной і той жа асобе. На сённяшні дзень застаецца загадкай пытанне аб тым, якім чынам була магла трапіць у сельскую мясцовасць сучаснага Хойніцкага раёна. Дадзеная акалічнасць стварае верагоднасць таго, што побач з месцам знаходкі пячаткі магло размяшчацца сярэднявечнае селішча, выяўленне і вывучэнне якога можа стаць адным з перспектыўных накірункаў археалагічнай дзейнасці ў рэгіёне ў будучым.


1. Археалогія Беларусі : энцыклапедыя. У 2 т. Т. 2 / Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2011. – 464 с.

2. Янин, В. Л. Актовые печати Древней Руси X–XV вв. В 2 т. Т. 1. Печати X – начала XIII в. / В. Л. Янин. – М. : Наука, 1970. – 325 с.

3. Цітоў, А. Пячаткі старажытнай Беларусі: Нарысы сфагістыкі. – Мінск : Полымя, 1993. – 293 с.

4. Харашкевіч, Г. Л. Полацкія пячаткі XV стагоддзя / Г. Л. Харашкевіч // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. –1974. – № 1. – С. 26–30.

5. Шталенков, И. Н. О находках вислых печатей в окрестностях города Орша / И. Н. Шталенков // Трэція навуковыя чытанні памяці прафесара Валянціна Навумавіча Рабцэвіча (1934–2008) : тэз. дакл., Мінск, 16–18 мая 2018 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: В. М. Сідаровіч (гал. рэд.), І. Н. Колабава, А. М. Плавінскі. – Мінск : БДУ, 2018. – С. 24–26.

6. Археологическое наследие Беларуси = Archaeological Heritage of Belarus / Нац. акад. Наук Беларуси, Ин-т истории. – 2-е изд., испр. и доп. – Минск : Беларуская навука, 2020. – 200 с.

7. Алфьоров, О. Моліўдовули київських князів другої половини XI – кінця XII століття (за матеріалами сфрагістичної колекції О. Шереметьєва) / О. Алфьоров // Сфрагістичний щорічник / НАН України, Інститут української археографії та джерелознавства ім. М. С. Грушевського, Інститут спеціальних історичних дисциплін Музею Шереметьєвых. – Київ, 2012. – Вип. II. – С. 5–74.

8. Туаллагов, А. А. Елена Ясыня – великая княгиня Киевской Руси / А. А. Туаллагов // Вестник Владикавказского научного центра. – 2019. – Т. 19, № 1. – С. 12–16.

9. Жуков, И. А. Вислые печати княжны Елены Ясыни, жены Киевского князя Ярополка Владимировича / И. А. Жуков // Нумізматика і Фалеристика : довіково-інформаційний журнал. – Київ, 2012. – № 2(62). – С. 5–6.

10. Эйдель, Е. М. К вопросу о датировке женских древнерусских печатей на примере контрмаркирования буллы Ефросинии Полоцкой из коллекции Алексея Шереметьева / Е. М. Эйдель // Сфрагістичний щорічник / НАН України, Інститут української археографії та джерелознавства ім. М. С. Грушевського, Інститут спеціальних історичних дисциплін Музею Шереметьєвых. – Київ, 2013. – Вип. IV. – С. 108–118.

11. Алфьоров, О. Жиночі печаткі Київської Русі / О. Алфьоров // Спеціальні історичні дисципліни: питання теоріі та методики : збірник наукових праць. Київ : НАН України, Інститут історії України, 2013. – Число 22–23. – С. 488–502.

12. ПСРЛ. Ипатьевская Лѣтопись. – Т. 2. – 2-е изд. – СПб. : Тип. М. А. Александрова, 1908. – 638 с.



**Дворниченко А.Ю.**


## ВЕЛИКОЕ КНЯЖЕСТВО ЛИТОВСКОЕ И СТАРИНЫ (БЫЛИНЫ). К ИСТОРИЧЕСКОЙ ТРАКТОВКЕ ФОЛЬКЛОРА


*Ключевые слова:* былины, старины, Великое Княжество Литовское, фольклор, контаминация.


Ста̀рины, известные в научном мире под названием «былины» – удивительный памятник русского фольклора, который давно уже вызывает большой интерес у специалистов и не только у них. Интерес, в свою очередь, провоцирует горячие споры. Не вступая в них, сформулируем проблему так: былины в ВКЛ и ВКЛ в былинах. Эта «двусторонняя» проблема весьма интересна, поскольку позволяет в очередной раз вернуться к теме именно *исторической* трактовки фольклора на фоне увлечения сейчас